НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

УДК 808.26-541.2

(ознакомительный фрагмент)

БУТ-ГУСАІМ СВЯТЛАНА ФЕАДОСЬЕЎНА

# ВАРЫЯТЫЎНАСЦЬ І ПРАГМАТЫЧНАЯ ЗНАЧНАСЦЬ СЛОВА Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

(на матэрыяле субстантыўнай лексікі)

10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

Мінск – 2003

Праца выканана на кафедры рускай і беларускай моў з методыкай выкладання Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна

Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук
прафесар **В.І. Сянкевіч**
кафедра рускай і беларускай моў з методыкай выкладання
Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук
прафесар **У.І. Коваль**
кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства
Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны

кандыдат філалагічных навук
**А.І. Шаблоўскі**
аддзел дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі
Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Абарона адбудзецца 25 лютага 2003 г. у $14^{00}$ гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 01.43.01 у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г.Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2. Тэл. 284-15-94).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы "23" студзеня 2003 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук С.Я. Рапацэвіч

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**. Праблема ўзаемадзеяння варыятыўнасці і прагматычнай значнасці слова ў маўленні з'яўляецца актуальнай для айчыннага мовазнаўства па прычыне яе недастатковай распрацаванасці. Факты варыятыўнасці лексічных адзінак мовы-маўлення амаль не вывучаліся ў суаднесенасці з суб'ектам маўлення, яго ментальнасцю і эмацыянальнай сферай, а калі і закраналіся ў асобных даследаваннях, то больш у рэчышчы стылістычнага апісання мовы, вывучэння экспрэсіўнай афарбоўкі слоў і канструкцый, а таксама пытанняў фразеалогіі і культуры мовы (працы Г.М.Малажай, П.А.Чайкуна, У.І.Коваля, П.У.Сцяцко, М.Н.Крыўко, В.Дз.Старычонка, С.Б.Кураша і інш.). Між тым разгляд мовы ў кантэксце чалавечай дзейнасці з'яўляецца адным з магістральных напрамкаў сучаснага мовазнаўства. Адзначаны падыход дазваляе па-новаму інтэрпрэтаваць традыцыйныя моўныя з'явы, выпрацаваць новыя парадыгмы лінгвістычных даследаванняў, асэнсаваць тыя змены, якія адбываюцца ў мове ў сувязі з сацыяльнымі з'явамі і развіццём грамадства.

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі**. Дысертацыя выканана ў рамках Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Беларуская мова, яе гісторыя, сучасны стан і сувязі з іншымі славянскімі мовамі" (Беларуская мова), адобранай рашэннем Кабінета міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6.03.1995 г. № 05/520-57. Праца выконвалася таксама ў межах навукова-даследчай тэмы "Варыятыўнасць і прагматычная значнасць слова ў беларускай мове" (№ ДзР 1999938), якая распрацоўваецца з 1999 года на кафедры рускай і беларускай моў з методыкай выкладання Установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна" (навуковы кіраўнік – праф. В.І.Сянкевіч).

**Мэтай дысертацыі** з'яўляецца вызначэнне прыроды і заканамернасцей лексічнага вар'іравання субстантыўнай лексікі сучаснай беларускай мовы ў сувязі з прагматыкай маўлення.

Умовай для дасягнення пастаўленай мэты было рашэнне наступных задач:

– акрэсліць асноўныя паняцці, звязаныя з вывучэннем варыятыўнасці субстантыўнай лексікі беларускай мовы;
– сістэматызаваць і апісаць факты вар'іравання плана выражэння і плана зместу субстантыўнай лексікі ў сучаснай беларускай мове;
– прааналізаваць механізмы вар'іравання субстантыўнай лексікі, ужытай у функцыі іменавання, у суаднесенасці з прагматычнай катэгорыяй значнасці (асабістай і сацыяльнай значнасцю);
– вызначыць заканамернасці вар'іравання субстантыўнай лексікі, ужытай у функцыі характарыстыкі, у адносінах да прагматычнай катэгорыі ацэнкі (эмацыянальнай і рацыянальна-нарматыўнай ацэнкі);

- апісаць звязаныя з лексіка-прагматычнай варыятыўнасцю субстантыўнай лексікі працэсы суб'ектна-прэдыкатнай транспазіцыі.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца прагматычна маркіраваная субстантыўная лексіка беларускай мовы. Прадмет даследавання – лексіка-прагматычная варыятыўнасць як уласцівасць актуалізаваных у маўленні субстантыўных адзінак.

**Матэрыялам даследавання** паслужылі факты, узятыя з тэкстаў мастацкіх твораў беларускай літаратуры, перыядычнага друку, вуснага маўлення. Выкарыстоўваецца лексікаграфічная інфармацыя з Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы (ТСБМ), Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы (ЭСБМ), «Толкового словаря живого великорусского языка» У.У.Даля.

**Гіпотэза даследавання**. У якасці гіпотэзы даследавання прымаецца ідэя аб сувязі варыятыўнасці лексічных адзінак з асноўнымі функцыямі, якія актуалізуюцца ў выказванні – функцыяй іменавання і функцыяй характарыстыкі, і абумоўленасці вар'іравання субстантыўнай лексікі такімі прагматычнымі катэгорыямі, як значнасць і ацэнка.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічнай асновай даследавання з'яўляюцца філасофскія катэгорыі "ўстойлівае" і "зменлівае", "субстанцыя" і "форма", "адзінкавае" і "агульнае", у якіх асэнсоўваюцца універсальныя сувязі чалавечага быцця, мыслення і мовы. З пункту гледжання сацыяльнай псіхалогіі, феномен варыятыўнасці вывучаецца ў кантэксце паняццяў "індывідуальнае" і "сацыяльнае", "сваё" і "чужое", "аб'ектывацыя" і "творчасць".

Асноўным метадам даследавання з'яўляецца метад функцыянальна-семантычнага аналізу, які прадугледжвае вывучэнне сістэмных адносін слова і спецыфікі рэалізацыі яго семантычных і прагматычных патэнцый у маўленні. Акрамя гэтага, у працы выкарыстоўваюцца апісальны і параўнальны метады.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**. Як сама навуковая праблема, так і падыходы да яе вырашэння з'яўляюцца новымі для айчыннага мовазнаўства. Выкананая праца – першы ў айчыннай лінгвістыцы вопыт манаграфічнага даследавання лексічнай варыятыўнасці ў сувязі з прагматыкай маўлення. Навізна працы заключаецца ў паслядоўным выкарыстанні прынцыпу антрапаморфнасці пры апісанні і тлумачэнні фактаў актуалізацыі лексічных адзінак у маўленні. Адзначаны прынцып дазваляе па-новаму разгледзець праблему адносін іменнай і характарыстычнай лексікі да аб'ектаў рэчаіснасці і да носьбітаў мовы, якія карыстаюцца гэтымі адзінкамі ў сітуацыі непасрэднай камунікацыі. На падставе распрацаванай канцэпцыі варыятыўнасці субстантыўнай лексікі вызначаюцца новыя падыходы да сістэматызацыі і класіфікацыі традыцыйных лінгвістычных з'яў.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў**. Вынікі праведзенага даследавання могуць мець як агульнатэарэтычнае значэнне, так і практычнае выкарыстанне. Тэарэтычная значнасць дысертацыі абумоўлена

фундаментальным характарам праблемы, якая ў ёй распрацоўваецца сувязь лексічнай варыятыўнасці з прагматыкай маўлення. Прадстаўлены у працы падыход да вывучэння лексічнай варыятыўнасці можа спрыяць далейшаму развіццю герменеўтычнага напрамку ў сучаснай беларусістыцы, у якім распрацоўваюцца антрапалагічныя асновы маўленчай і мысліцельнай дзейнасці, вывучаюцца суадносіны адлюстраванай у мове рэчаіснасці з маштабамі ведаў і светапоглядам чалавека.

Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны як у навуковай сферы (агульным мовазнаўстве, стылістыцы, культуры мовы, рыторыцы, тэорыі маўленчай дзейнасці, лінгвапрагматыцы, сацыялінгвістыцы, тэорыі рэферэнцыі, лексікаграфіі), так і ў вучэбна-метадычнай сферы (пры выкладанні лінгвістычных дысцыплін у ВНУ, падрыхтоўцы спецкурсаў і спецсемінараў па паглыбленым вывучэнні лінгвапрагматыкі).

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Аснову лексіка-прагматычнай варыятыўнасці субстантыўнай лексікі беларускай мовы складае дыхатамія іменных і характарыстычных адзінак, якая абапіраецца на супрацьпастаўленне рэалізаваных у маўленні функцый – вылучэння (іменавання) і характарыстыкі. Адзначаныя функцыі фарміруюць адэкватныя ім сродкі выражэння, якія атрымліваюць у маўленчай дзейнасці тую ці іншую прагматычную спецыялізацыю.

2. Вызначальнай для вар'іравання іменных адзінак у маўленні з'яўляецца прагматычная катэгорыя значнасці. Дыяпазон вар'іравання іменнай лексікі абумоўлены характарам успрымання рэчаіснасці суб'ектам – ступенню асабістай або сацыяльнай значнасці аб'екта ўспрымання. Механізм вар'іравання характарыстычных адзінак абумоўлены прагматычнай катэгорыяй ацэнкі – суб'ектыўнымі (эмацыянальнымі і рацыянальна-нарматыўнымі) адносінамі гаворачага да рэчаіснасці.

3. Іменныя і характарыстычныя адзінкі адрозніваюцца тыпам варыятыўнасці. Зменлівасць іменных адзінак звязана з захаваннем тэматычнай тоеснасці (інварыянтнасці) мадыфікацый імені. Аснову варыятыўнасці характарыстычнай лексікі складаюць працэсы суб'ектна-прэдыкатнай транспазіцыі, якія абумоўліваюць відазмяненні слова паводле дыстынктыўных прымет і параджаюць сінтаксічна абумоўленыя лексічныя транспазіты.

4. Іменныя рэферэнтныя варыянты (мадыфікацыі) прызначаны для фіксацыі ў маўленні "майго" (падобнага да суб'екта, знаёмага) свету, у якім адбываецца асэнсаванне рэчаіснасці на прадмет яе асабістай значнасці для суб'екта маўлення. Іменныя дэнататыўныя выразы адлюстроўваюць у свядомасці "свой" (адпаведны суб'екту, ідэалагізаваны, вядомы) свет. Вар'іраванне гэтага разраду лексікі абумоўлена катэгорыяй сацыяльнай значнасці.

5. Функцыя характарыстыкі рэалізуецца ў двух тыпах моўных адзінак, што дае падставу гаварыць пра існаванне двух узроўняў характарызацыі аб'екта – пазалагічнага (дэскрыптыўнага, пластычнага), які выяўляецца ў

індывідуальных характарыстыках, і лагічнага (прэскрыптыўнага), які прадстаўлены ў тыпалагічных характарыстыках. З аднаго боку, у мове існуюць адзінкі, якія характарызуюць індывідуума паводле знешняй (акцыдэнтнай, выпадковай) рысы, з другога – тыпалагічныя характарыстыкі, якія акрэсліваюць клас прадметаў і асобных прадстаўнікоў класа паводле характэрнай прыметы.

6. Вар'іраванне індывідуальных і тыпалагічных характарыстык абумоўлена прыродай славеснай творчасці, якая, як і любая творчасць, ажыццяўляецца "паводле вобраза і падабенства" творцы.

**Асабісты ўклад суіскальніка**. Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем, якое выканана на арыгінальным моўным матэрыяле, выбраным з твораў мастацкай літаратуры, публіцыстыкі, гутарковага маўлення, і на падставе распрацаванай аўтарам навуковай канцэпцыі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**. Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі прайшлі апрабацыю на міжнародных канферэнцыях: "Словаўтварэнне і намінатыўная дэрывацыя ў славянскіх мовах" (Гродна, 14-15 красавіка 2000 г.), "Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія" (Віцебск, 25-27 мая 2000 г.), на рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцыях: на канферэнцыі маладых вучоных Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна (Брэст, 18-19 мая 1999 г.), "Рэформа школы: навучанне і выхаванне малодшых школьнікаў" (Брэст, 5 лістапада 1999 г.), "Сучасныя праблемы беларусікі" (Брэст, 16-17 снежня 1999 г.), V Рэспубліканскай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў Рэспублікі Беларусь (Гродна, 25-27 красавіка 2000 г.), II навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна (Брэст, 17-19 мая 2000 г.), "Выкарыстанне перадавых тэхналогій навучання ў пачатковай школе" (Гродна, 16-17 кастрычніка 2002 г.), "Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове і літаратуры" (Брэст, 24-25 кастрычніка 2002 г.).

Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні кафедры рускай і беларускай моў з методыкай выкладання Установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна".

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў дзесяці публікацыях аўтара: 3 артыкулах у рэспубліканскіх навуковых выданнях, 7 артыкулах у зборніках навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый складае 44 друкаваныя старонкі.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, дзвюх глаў, заключэння і спіса выкарыстанай літаратуры (228 адзінак). Агульны аб'ём даследавання – 115 старонак.

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца выбар тэмы, даецца агляд навуковых даследаванняў па праблеме варыятыўнасці рознаўзроўневых адзінак мовы, аргументуецца мэтазгоднасць вывучэння лексічнай варыятыўнасці ў сувязі з прагматыкай маўлення.

У **агульнай характарыстыцы працы** вызначаецца актуальнасць тэмы даследавання, акрэсліваюцца яго аб'ект і прадмет, фармулюецца гіпотэза, раскрываюцца навізна, тэарэтычная і практычная значнасць працы, прыводзяцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, змяшчаецца інфармацыя пра апрабацыю вынікаў даследавання, яго структуру і аб'ём.

У **главе 1** "*Функцыя іменавання: прагматычная значнасць і варыятыўнасць субстантыўнай лексікі беларускай мовы*" разглядаюцца механізмы вар'іравання субстантыўнай лексікі, ужытай у функцыі іменавання, у суаднесенасці з прагматычнай катэгорыяй значнасці. Глава складаецца з трох раздзелаў.

У першым раздзеле "*Перадумовы даследавання*" акрэсліваюцца лінгвафіласофскія перадумовы выяўлення аб'екта як значнага і спосабы фіксацыі яго значнасці ў маўленчай дзейнасці. Канцэпт значнасці разумеецца як адлюстраваная ў свядомасці чалавека здольнасць аб'екта быць звязаным з задавальненнем тых ці іншых (матэрыяльных або духоўных) патрэб суб'екта. Выражэнне ўяўлення пра значнасць аб'екта рэчаіснасці звязана з фундаментальнай функцыяй маўлення – функцыяй вылучэння (называння, іменавання, намінатыўнай функцыяй). Апарат адзначанай функцыі не абмяжоўваецца катэгорыяй імені, а ўключае ў сябе шматлікія сродкі факусіравання ўвагі на найбольш значным (важным) для суб'екта маўлення аб'екце (інтанацыя, лагічны, эмфатычны націск у вусным маўленні; тоўсты шрыфт, курсіў, падкрэсліванне, вялікая літара ў пісьмовым).

Лексічная фіксацыя значнасці аб'ектаў рэчаіснасці ажыццяўляецца іменнымі, або ідэнтыфікуючымі, адзінкамі, асноўнае прызначэнне якіх – вылучыць прадмет як важны ў пэўных адносінах факт рэчаіснасці. Імёны інфарматыўныя па сваёй прыродзе. Ступень значнасці іменнай адзінкі вызначаецца ступенню яе інфарматыўнасці – насычанасці эмпірычнымі ці сацыялагічнымі звесткамі аб носьбіце імені. Апошняе і з'яўляецца вызначальным фактарам вар'іравання субстантыўных адзінак у функцыі іменавання.

У працэсе ўзаемадзеяння суб'екта з навакольным светам адрозніваюцца два прынцыпова розныя моманты: калі рэальнасць успрымаецца і калі яна адлюстроўваецца. Падставай адзначанага супрацьпастаўлення з'яўляецца тое, што, па-першае, існуе матэрыяльная ў сваёй аснове рэчаіснасць, якая знаходзіцца па-за чалавекам і можа быць зафіксавана па меры пашырэння яго пазнавальнага гарызонта, і, па-другое, існуе тая ж самая рэальнасць, але ўжо

характэрнай, адрознівае яго ад іншых аб'ектаў і рэгулярна выяўляецца ў адносінах да рэчаіснасці [2; 5; 9].

6. Змяненне ў маўленні характарыстычнай лексікі абумоўлена прыродай славеснай творчасці, якая ажыццяўляецца "паводле вобраза і падабенства" творцы.

А. Вар'іраванне характарыстычных адзінак, якія спецыялізуюцца на выкананні функцыі індывідуальнай характарыстыкі аб'екта, грунтуецца на адносінах падабенства. Гэтыя адносіны з'яўляюцца падставай для пабудовы мадэлей рэальна існуючых прадметаў і з'яў. Паводле падабенства ажыццяўляецца пластычнае і жывапіснае славеснае мадэляванне рэчаіснасці. Пластычныя славесныя мадэлі абумоўлены індывідуальна-аўтарскім бачаннем рэчаіснасці, маюць дэмінутыўны характар і дапускаюць шырокі маўленчы палімарфізм. Сродкам жывапіснага (выяўленчага) мадэлявання рэчаіснасці словам з'яўляецца эпітэт, які выступае мастацкай характарыстыкай індывідуальнага светаадлюстравання. У аснове працэсу аб'ектывацыі рэчаіснасці словам ляжыць паняцце "непадобнага" ("іншага"). Адным з найбольш распаўсюджаных сродкаў адчужальнай аб'ектывацыі з'яўляецца мянушка – індывідуальна-характарызуючая метка, якой чалавек пераводзіцца ў свет рэчаў [1; 2; 3; 9].

Б. Вызначальную ролю ва ўжыванні тыпалагічных характарыстык адыгрывае вобраз (прынцып адпаведнасці-неадпаведнасці). Вобраз заключае ў сабе веды аб прадмеце, у аснове якіх ляжаць належныя адносіны. Паводле адносін адпаведнасці агульнапрынятым уяўленням аб належным будуюцца, як правіла, перыфрастычныя ўтварэнні. У выражэнні адмоўных характарыстык паслядоўна праяўляецца адзін з асноўных прынцыпаў адлюстравання свету: фіксацыя перш за ўсё анамальных з'яў, рознага роду адхіленняў ад нормы. У такіх выпадках выкарыстоўваецца не вобраз, а яго супрацьлегласць – абраза, г.зн. неадпаведнае рэчаіснасці скажонае адлюстраванне, якое мае, як правіла, метафарычны характар [2; 6].

Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях:

## Артыкулы


1. Бут-Гусаім С.Ф. Сімволіка і семантыка-прагматычныя характарыстыкі слова // Весці Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2000. – № 1. – С. 145-148.
2. Бут-Гусаім С.Ф. "Знаёмае" ці "вядомае"? (да праблемы выражэння пачуццёвай рэальнасці ў мове) // Весн. Мазырскага дзярж. пед. ін-та. – 2001. – № 5. – С. 74-79.
3. Бут-Гусаім С.Ф. Характарыстычныя назвы чалавека ў беларускай мове // Весн. Брэсцкага ун-та. – 2001. – № 5. – С. 58-66.

**Матэрыялы канферэнцый**


4. Бут-Гусаім С.Ф. Варыятыўнасць як уласцівасць мовы і лінгвістычная праблема // Науч.-метод. конф. молодых учёных Брестского гос. ун-та им. А.С.Пушкіна (18-19 мая 1999 года): Сб. материалов / М-во обр-ния Респ. Беларусь. Брестский гос. ун-т. – Брест: БрГУ, 1999. – С. 49-51.
5. Бут-Гусаім С.Ф. Выкарыстанне эмацыянальна-экспрэсіўных варыянтаў назоўнікаў у дзіцячым маўленні // Рэформа школы: навучанне і выхаванне малодшых школьнікаў: Матэрыялы рэгіянальн. навук. канф., Брэст, 5 лістапада 1999 г. / Брэсцкі дзярж. ун-т. Кафедра рус. і бел. моў з методыкай выкладання. – Брэст: БрДУ, 2000. – С. 73-75.
6. Бут-Гусаім С.Ф. Варыятыўнасць і прагматычная роля ўласнага імені ў мастацкім тэксце // Сучасныя праблемы беларусікі: Матэрыялы канф., прысвечанай У.А.Калесніку, Брэст, 16-17 снежня 1999 г. / Брэсцкі дзярж. ун-т. Філалаг. фак-т. Кафедра бел. літаратуразнаўства. – Брэст: БрДУ, 2000. – С. 140-144.
7. Бут-Гусаім С.Ф. Дыяпазон эмацыянальна-экспрэсіўнага вар'іравання і дэрывацыйныя ўласцівасці антрапонімаў // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Материалы VII Междунар. науч. конф., Гродно, 14-15 апр. 2000 г. / Гродненский гос. ун-т. Филолог. фак-т. – Гродно: ГрГУ, 2000. – С. 346-350.
8. Бут-Гусаім С.Ф. Маўленчы этас і варыятыўнасць уласнага імя // V Респ. науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов Респ. Беларусь (25-27 апреля 2000 года): Сб. материалов / М-во обр-ния Респ. Беларусь. Бел. координац. центр науч.-исслед. работы студентов. Гродненский гос. ун-т. Гродненский гос. мед. ун-т. – Гродно: ГрГУ, 2000. – Ч. 3. – С. 52-55.
9. Бут-Гусаім С.Ф. Прагматыка дэскрыпцыі як спосабу рэферэнцыі // II науч.-метод. конф. молодых учёных (17-19 мая 2000 года): Сб. материалов / М-во обр-ния Респ. Беларусь. Брестский гос. ун-т. – Брест: БрГУ, 2000. – С. 118-120.
10. Бут-Гусаим С.Ф. Польские элементы в антропонимии Брестчины // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: Матэрыялы V Міжнар. навук. канф., Віцебск, 25-27 мая 2000 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. Віцебскі дзярж. ун-т імя П.М.Машэрава. Фонд фундаментальных даследаванняў НАН Беларусі. Ін-т польскі ў Мінску. – Віцебск: ВДУ, 2000. – С. 13-15.

# РЭЗЮМЕ

*Бут-Гусаім Святлана Феадосьеўна*

**Варыятыўнасць і прагматычная значнасць слова ў беларускай мове (на матэрыяле субстантыўнай лексікі)**

**Ключавыя словы**: варыятыўнасць, прагматычная значнасць, субстантыўная лексіка, функцыя іменавання, функцыя характарыстыкі, рэферэнт, дэнатат, інфарматыўнасць, камунікатыўнасць, індывідуальная характарыстыка, тыпалагічная характарыстыка, суб'ектывацыя, аб'ектывацыя.

**Аб'ект даследавання –** прагматычна маркіраваная субстантыўная лексіка беларускай мовы.

**Прадмет даследавання** – лексіка-прагматычная варыятыўнасць як уласцівасць актуалізаваных у маўленні субстантыўных адзінак.

**Мэта даследавання** – вызначэнне прыроды і заканамернасцей лексічнага вар'іравання субстантыўнай лексікі сучаснай беларускай мовы ў сувязі з прагматыкай маўлення.

**Метады даследавання**. Асноўным метадам даследавання з'яўляецца метад сістэмна-функцыянальнага аналізу, выкарыстоўваюцца таксама апісальны і параўнальны метады.

**Навуковая навізна даследавання**. Дысертацыя з'яўляецца першай у беларускай лінгвістыцы спробай манаграфічнага даследавання лексічнай варыятыўнасці ў сувязі з прагматыкай маўлення. Навізна працы заключаецца ў паслядоўным выкарыстанні прынцыпу антрапаморфнасці пры апісанні і тлумачэнні фактаў актуалізацыі лексічных адзінак у маўленні. Адзначаны прынцып дазваляе па-новаму разгледзець праблему адносін іменнай і характарыстычнай лексікі да аб'ектаў рэчаіснасці і да гаворачых.

**Тэарэтычная значнасць** дысертацыі абумоўлена фундаментальным характарам праблемы, якая ў ёй распрацоўваецца – сувязь лексічнай варыятыўнасці з прагматыкай маўлення. Прадстаўлены ў працы падыход да вывучэння лексічнай варыятыўнасці можа спрыяць далейшаму развіццю герменеўтычнага напрамку ў сучаснай беларусістыцы, у якім распрацоўваюцца антрапалагічныя асновы маўленчай і мысліцельнай дзейнасці.

**Практычная значнасць даследавання.** Назіранні і вывады працы могуць быць выкарыстаны выкладчыкамі вышэйшай школы пры чытанні курсаў лексікалогіі, лінгвістыкі тэксту, агульнага мовазнаўства, рыторыкі, тэорыі маўленчай дзейнасці, стылістыкі, пры падрыхтоўцы спецкурсаў і спецсемінараў па паглыбленым вывучэнні лінгвапрагматыкі.

# РЕЗЮМЕ

*Бут-Гусаим Светлана Феодосьевна*

**Вариативность и прагматическая значимость слова в белорусском языке (на материале субстантивной лексики)**

**Ключевые слова**: вариативность, прагматическая значимость, субстантивная лексика, функция именования, функция характеристики, референт, денотат, информативность, коммуникативность, индивидуальная характеристика, типологическая характеристика, субъективация, объективация.

**Объект исследования** – прагматически маркированная субстантивная лексика белорусского языка.

**Предмет исследования** – лексико-прагматическая вариативность как свойство актуализированных в речи субстантивных единиц.

**Цель исследования** – определение природы и закономерностей лексического варьирования субстантивной лексики современного белорусского языка в связи с прагматикой речи.

**Методы исследования.** Основным методом исследования является метод системно-функционального анализа, используются также описательный и сравнительный методы.

**Научная новизна исследования**. Диссертация является первой в белорусской лингвистике попыткой монографического изучения лексической вариативности в связи з прагматикой речи. Новизна работы заключается в последовательном использовании принципа антропоморфности при описании и объяснении фактов актуализации лексических единиц в речи. Отмеченный принцип позволяет по-новому рассмотреть проблему отношения именной и характеризующей лексики к объектам действительности и к говорящим.

**Теоретическая значимость** диссертации обусловлена фундаментальным характером проблемы, которая в ней разрабатывается – связь лексической вариативности с прагматикой речи. Представленный в работе подход к изучению лексической вариативности может способствовать дальнейшему развитию герменевтического направления в современной белорусистике, в котором разрабатываются антропологические основы речевой и мыслительной деятельности.

**Практическая значимость исследования**. Наблюдения и выводы работы могут быть использованы преподавателями высшей школы при чтении курсов лексикологии, лингвистики текста, общего языкознания, риторики, теории речевой деятельности, стилистики, при подготовке спецкурсов и спецсеминаров по углубленному изучению лингвопрагматики.

## SUMMARY

*But-Gusaim Svetlana Feodosievna*

### Variation and Pragmatic Meaning of the Word in the Belarusian Language
### (on the material of substantivated lexics)

**Key-words**: variation, pragmatic meaning, substantivated lexics, naming function, characterizing function, referent, denotation, informativeness, communicativeness, individual characteristic, typological characteristic, subjectivation, objectivation.

**The object of research** – pragmatically marked substantivated lexics of the Belarusian language.

**The subjet of research** – lexical-pragmatic variation as characteristic of substantivated units, actualized in speech.

**The aim of research** – defining the nature and rules of lexical variation of substantivated lexics in the modern Belarusian language connected with the pragmatics of speech.

**Methods of Research**. The basic method of research is the method of system-functional analysis; descriptive and comparative methods are also used.

**Scientific Novelty of the Research**. The thesis is the first attempt in the Belarusian linguistics to study lexical variation in connection with pragmatics of speech. The novelty of this study consists in consequent usage of the principle of anthropomorphousness when describing and explaining the facts of actualizing lexical units in speech. The above-mentioned principle gives one more opportunity to view the problem of how nominal and characterizing lexical units are connected with the objects of reality and the speaker.

**Theoretical meaning** of the thesis is conditioned by fundamental character of the problem being worked out in this research. It is connection between lexical variation and pragmatics of speech. The approach to the study of lexical variation given in this work may contribute to further development of germeneutics in modern Belarusian science, where anthropological foundations of speech and thinking activity are being worked out.

**Practical Importance of the Research**. Observations and conclusions of this work may be used by teachers of higher educational establishments while delivering lectures in lexicology, linguistics of the text, general linguistics, rhetorics, the theory of speech, stylistics, and also while preparing special courses and seminars for more thorough study of linguistic pragmatics.